■ Асваенне Амерыкі

# І СЯБРОЎСТВА, І ВЫГАДА

## Венесуэла дала магчымасць Беларусі зрабіць першы крок у асваенні кантынента з паўмільярдным насельніцтвам

**«Зыход Уга Чавеса не азначае крах яго ідэй», — заявіў Пасол Венесуэлы на адкрыцці II Венесуэльска-беларускага форуму «Дасягненні і перспектывы двухбаковых адносін». Зараз у больш чым 10 штатах рэалізуецца вялікая колькасць сумесных праектаў амаль ва ўсіх даступных сферах: ад будаўніцтва аграгарадкоў да рэабілітацыі старых радовішчаў нафты.**

### БЕЛАРУСКІЯ ГІГАНТЫ Ў БАРЫНАСЕ

Год таму ў Барынасе — сталіцы аднайменнага венесуэльскага штата — у прамысловай зоне Санта-Інес адкрыліся два заводы па зборцы беларускай тэхнікі: філіял Мінскага аўтамабільнага завода («МАЗ-ВЕН») і Мінскага трактарнага завода («ВенеМінск Трактарэс»). А ў маі гэтага года там жа стала працаваць і трэцяе сумеснае прадпрыемства па зборцы камунальнай дарожнай тэхнікі — філіял завода «Амкадор».

*«Для Беларусі адкрыццё філіялаў гэтых заводаў уяўляе вялікую цікавасць,* — падкрэсліў **першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзімір СЯМАШКА.** — *Венесуэла ўваходзіць у Меркасур, мытны саюз кантынента, у які таксама ўваходзяць Бразілія, Аргенціна, Уругвай і Парагвай. А прадукцыя гэтых заводаў запатрабавана на рынку Лацінскай Амерыкі»*.

Магутнасць завода па выпуску аўтамабіляў МАЗ — 5 тысяч у год пры працы прадпрыемства ў адну змену і 10 тысяч — пры працы ў дзве змены. Гэта дазволіць забяспечыць запатрабаванасць у тэхніцы не толькі ўнутры краіны, але і за яе межамі. Што цікава, у Венесуэле ў мінулым годзе гэтая тэхніка дапамагла хутчэй пераадолець наступствы ліўневых дажджоў.

Акрамя будаўніцтва заводаў па зборцы тэхнікі, у штаце Міранда беларусы пабудавалі самы буйны ў Лацінскай Амерыцы завод па выпуску керамічных блокаў. Зараз ідзе праца па будаўніцтве другой лініі завода.

### ВЕНЕСУЭЛЬСКАЯ НАФТА: БЕЛАРУСКІ ПАДЫХОД

У Венесуэле беларусы здабываюць больш за тысячу тон нафты за год. Для параўнання, у нашай краіне з усіх радовішчаў у год мы можам атрымаць прыкладна 1700 тон.

Па апошніх даных, Венесуэла — самая багатая на нафту краіна. Менавіта «чорнае золата» з'яўляецца асновай яе эканомікі. Таму да нафта- і газаздабычы тут асаблівы падыход.

Беларуская прысутнасць у нафтаздабываючай сферы Венесуэлы мае пэўныя асаблівасці: нашы суайчыннікі займаюцца капітальным рамонтам ужо выпрацаваных свідравін і такім чынам даюць ім другое жыццё. З гэтага вынікае, што сумеснае прадпрыемства «Петралера БелаВенесалана» (60% акцый належаць Венесуэле, 40% — Беларусі) выгадна як беларускаму боку, так і венесуэльскаму.

Што да здабычы газу, то сумеснае прадпрыемства «ВенесуэлаГазСтрой» газіфікавала амаль дзве тысячы домаўладанняў; таксама ідзе праца па будаўніцтве магістральнага газаправода паміж сталіцамі двух штатаў Венесуэлы — Баркісімета (штат Лара) і Барынас (аднайменны штат).

Яшчэ адно прадпрыемства, звязанае як з нафтаздабычай у прыватнасці, так і са здабычай карысных выкапняў увогуле — «Сейсміка БелаВенесалана», займаецца сейсмічнай разведкай. Зараз ідзе праца па распрацоўцы фасфатных пародаў, затым будзе прымацца рашэнне аб будаўніцтве прадпрыемства па выпуску фасфатных угнаенняў. Нагадаем, гэты праект быў узгоднены падчас візіту Прэзідэнта нашай краіны ў Венесуэлу летам 2012 года.

### ЛЕПШЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ — ТЭХНАЛОГІІ

Пры здабычы нафты выдзяляецца вялікая колькасць так званага спадарожнага газу. **Аляксандр ЛАПКО, рэктар «Газ-Інстытута»** (Мінск) у сваім выступленні расказаў, як ад нулявога прыбытку ад гэтага рэчыва атрымліваць даход у 4,5 тысячы долараў за тону.

Штогод у Венесуэле здабываецца каля 120 мільёнаў тон нафты. На кожную здабытую тону прыходзіцца прыкладна 36 кубічных метраў спадарожнага газу. Як правіла, яго спальваюць у вялікіх факелах, і ніякай карысці гэта не прыносіць. Але, згодна з дакладам беларускага вучонага, існуе як мінімум тры спосабы даходнага выкарыстання гэтага рэчыва: перапрацоўка на газаперапрацоўчых заводах (і атрыманне гатовай прадукцыі — труб і поліэтылену), выкарыстанне ў якасці паліва і закачка гэтага газу ў нетры, што значна палегчыць здабычу нафты. Беларускае прадпрыемства ўдзельнічала ў праекце пераходу многіх відаў венесуэльскай тэхнікі на газаматорнае паліва, атрыманае з такога газу.

Патэнцыял выкарыстання спадарожнага газу рэктар «Газ-Інстытута» праілюстраваў на наступным прыкладзе: у мінулым годзе Венесуэла імпартавала з суседняй Калумбіі два мільярды кубічных метраў газу (коштам у 200 мільёнаў долараў), у тым жа годзе ў Венесуэле было згублена 4,5 мільярда кубічных метраў спадарожнага газу агульным коштам пры правільным выкарыстанні 450 мільёнаў долараў.

Жыллёвы комплекс, які праектуе і будуе ў венесуэльскім горадзе Маракай (штат Арагуа) беларуская кампанія «Белзамежбуд», адпавядае клімату Венесуэлы, яе архітэктурным традыцыям і ладу жыцця венесуэльцаў.

Завод па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, пабудаваны беларусамі ў прамысловай зоне «Эль Маркес» (штат Міранда). Агульная плошча прадпрыемства — 9,8 га.

### «ДАРОЖНАЯ КАРТА» ДЛЯ СЯБРОЎСТВА

Падчас летняга візіту ў Мінск **Прэзідэнта Венесуэлы Нікаласа МАДУРЫ** ў навінах шмат паведамлялася аб праекце так званай «дарожнай карты». Гэта праект дакумента, у які ўключаны перспектыўныя беларуска-венесуэльскія пагадненні ў розных сферах: ад будаўніцтва аграрна-індустрыяльных гарадкоў, кватэр да праектаў у касмічнай сферы. «Дарожная карта» разлічана на рэалізацыю праектаў да 2019 года і будзе прынята на наступным пасяджэнні беларуска-венесуэльскай сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў першым квартале 2014 года.

У «карту» ўключаны праекты па будаўніцтве асфальтавага завода, станцый тэхабслугоўвання, філіяла Беларускага аўтамабільнага завода, грамадзянска-ваеннага аэрадрома ў раёне Лібертадор горада Барынаса. Таксама, як адзначыў **Леанід МАРЫНІЧ, першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі,** выкананне праектаў «дарожнай карты» павінна знізіць залежнасць Венесуэлы ад імпарту прадуктаў харчавання. Па інфармацыі, агучанай на форуме, штогод краіна імпартуе іх у аб'ёме прыкладна 80% ад агульнай колькасці, неабходнай венесуэльцам.

Вялікую вагу ў «дарожнай карце» маюць праекты ў галіне будаўніцтва. Па словах **Ірыны Архіпавай, першага намесніка міністра архітэктуры і будаўніцтва,** беларускія праекты, што рэалізуюцца ў гэтай сферы, здаюцца ў час або нават раней за пастаўленыя тэрміны. Кватэры будуюцца ў штатах Барынас, Міранда, Арагуа, у федэральнай сталічнай акрузе Каракас. Што цікава, Барынас, дзе ўжо працуюць 3 сумесныя беларуска-венесуэльскія прадпрыемствы, атрымаў дзякуючы нашым землякам новы твар. Цяпер гэта індустрыяльна развіты горад, і, каб забяспечыць спецыялістаў, што будуць працаваць на новых прадпрыемствах, жыллём, выконваецца праект па будаўніцтве там 3 тысяч кватэр.

### ТЭОРЫЯ ДЗЕЛЯ ПРАКТЫКІ

Спецыяльна для ўдзелу ў форуме з Венесуэлы прыехаў **дырэктар Венесуэльскага інстытута навуковых даследаванняў (IVIC) Элой СІРА,** які зрабіў даклад пра сумесныя беларуска-венесуэльскія навуковыя праекты. Амаль усе яны з'яўляюцца практыка-арыентаванымі. Напрыклад, вытворчасць і захаванне вадароду, атрыманага з вуглевадароду, дазволіць у будучым вырабляць больш чыстае дызельнае паліва і экалагічны бензін. Сумесныя праекты па лячэнні ракавых захворванняў дадуць магчымасць венесуэльскім спецыялістам павысіць сваю кваліфікацыю ў беларускім Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры анкалогіі і медыцынскай радыялогіі.

Вынікі сумеснага з Інстытутам мікрабіялогіі НАН Беларусі праекта па распрацоўцы складаных мікраўгнаенняў для зернебабовых культур уяўляе для Венесуэлы асаблівую цікавасць: яны значна павышаюць прадуктыўнасць і не прыносяць шкоды глебе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# САЛЬДА НЕАРГАНІЗАВАНАГА ГАНДЛЮ «МІНУС» 0,5 МЛРД ДОЛАРАЎ

**Па выніках ананімнага абследавання фізічных асоб у аўтадарожных пунктах пропуску на мяжы з Польшчы, Украіны, Літвы, Латвіі імпартуюцца адзенне, абутак, прадукты харчавання, тэлевізары, алкагольныя напоі, шыны, бытавая хімія, сродкі гігіены, камп'ютарная тэхніка і сродкі сувязі, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.**

Дзяржаўныя органы Беларусі з удзелам Нацыянальнага банка напрыканцы верасня правялі анкетаванне ў сямі аўтадарожных пунктах пропуску на мяжы нашай краіны, што ахоплівала як беларускіх, так і замежных грамадзян, якія перасяклі яе аўтамабільным транспартам. Апрацоўка атрыманых даных дазволіла вызначыць аб'ёмы, структуру, накіраванасць неарганізаваных знешніх таварных патокаў і паслуг міжнароднага турызму. Дарэчы, асноўныя тавары, якія экспартуюцца ў вышэйназваныя краіны — гэта бензін, дызельнае паліва, адзенне, абутак, тытунёвыя вырабы, алкагольныя напоі, а таксама цукар, крупы і макаронныя вырабы.

Чакаецца, што з улікам атрыманых даных сальда знешняга гандлю таварамі, якія будуць перамешчаны фізічнымі асобамі цераз мяжу Рэспублікі Беларусь з Польшчай, Украінай, Літвой, Латвіяй (без уліку неарганізаванага гандлю з Расійскай Федэрацыяй), у 2013 годзе будзе адмоўным і можа дасягнуць у эквіваленце «мінус» 0,5 млрд долараў.

Вынікі абследавання накіраваны зацікаўленым органам кіравання Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны банк атрыманыя даныя выкарыстае пры складанні плацежнага балансу Рэспублікі Беларусь за 2013 год.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Касмічныя тэхналогіі

# БЕСПІЛОТНАЯ АВІЯЦЫЯ «НАБІРАЕ ВЫШЫНЮ»

**Беспілотная авіяцыя, якую сёння ствараюць на прадпрыемствах Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, добра зарэкамендавала сябе ў краіне. Паспяхова заваёўвае яна і сусветны рынак. Касмічныя тэхналогіі і робататэхніка — такой бачаць там будучыню айчыннай ваеннай прамысловасці. Напярэдадні 10-гадовага юбілею маладой структуры пра гэта паведаміў старшыня Дзяржкамваенпрама Сяргей ГУРУЛЁЎ.**

Найбольш важнае дасягненне Дзяржкамваенпрама — развіццё перспектыўных абарончых тэхналогій. Сярод іх — інфармацыйныя тэхналогіі, тэлекамунікацыі, аўтаматызаваныя сістэмы кіравання, электронна-аптычныя сістэмы, прыборабудаванне, мадэрнізацыя ўзбраення і ваеннай тэхнікі савецкай і расійскай вытворчасці.

— Нядаўна я дакладваў кіраўніку дзяржавы, што з авіяцыйнага парку, які ў нас існуе, за выключэннем самалётаў Л-39 і Іл-76, прадпрыемствы Дзяржкамваенпрама засвоілі рамонт усёй авіяцыйнай тэхнікі і яе мадэрнізацыю, — нагадаў Сяргей Пятровіч. — Гэта тычыцца і зброі проціпаветранай абароны, уключаючы комплексы С-300, не кажучы ўжо пра бранятанкавую тэхніку і тэхніку лёгкага ўзбраення. Па вялікім рахунку, усе базавыя машыны ППА і ракетных войск — работа нашых спецыялістаў.

Сёння Дзяржкамваенпрам аб'ядноўвае больш за 200 распрацоўшчыкаў і вытворцаў прадукцыі ваеннага прызначэння. На 23 абарончых прадпрыемствах і арганізацыях працуе каля 15 тысяч супрацоўнікаў. Сярод іх — 78 кандыдатаў і 13 дактароў навук.

Супрацоўніцтва ваенна-прамысловага камітэта наладжана з 60 краінамі свету.

— Мы працуем у жорсткіх умовах канкурэнцыі. Нам ніхто не стварае ні платформаў, ні плацдармаў на тэрыторыі нашых партнёраў, — падкрэсліў старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта. — Па-ранейшаму прыярытэтным стратэгічным партнёрам у галіне ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва застаецца Расійская Федэрацыя. Менавіта яна забяспечвае нас амаль трэцяй часткай агульнага аб'ёму валютных сродкаў, якія паступаюць.

Фота БЕЛТА.

Важнейшай вяхой выхаду маладой структуры на новы ўзровень стала прыняцце Дзяржаўнай праграмы ўзбраення на 2006 — 2015 гады, якая прадугледжвае паэтапнае тэхнічнае пераазнаішчэнне Узброеных Сіл краіны. Дарэчы, гэта першы найбольш маштабны ваенна-тэхнічны праект за ўсю гісторыю суверэннай Беларусі! Праведзеныя ў яго рамках мерапрыемствы значна павялічылі баявы патэнцыял і магчымасці войск.

У праграме на 2011 — 2015 гады зроблены ўхіл на развіццё такіх прыярытэтных кірункаў, як баявыя геаінфармацыйныя сістэмы, аснашчэнне войск беспілотнымі авіяцыйнымі комплексамі, сістэмы комплекснага процідзеяння высокадакладнай зброі, баявыя сістэмы сіл спецыяльных аперацый і сухапутных войск, сістэмы агнявога паражэння.

— Мы разумеем, што ў сучасных абставінах патрэбна займацца ўзбуйненнем, — зазначыў Сяргей Гурулёў. — Пад гэтым я маю на ўвазе цэнтралізацыю навуковай думкі, навуковага і вытворчага патэнцыялу прадпрыемстваў. Самі разумееце, што ў буйнога брэндавага вытворцы больш шанцаў замацавацца на знешнім рынку. Таму ў нас ужо функцыянуюць холдынгі, а сёння працуем над стварэннем больш складанай структуры — Абаронпрама. Гэта нам неабходна, і мы разлічваем на падтрымку.

**Вераніка КАНЮТА**

■

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# «Бірулёва» ў Мінску не будзе

**Сёння ў Беларусі попыт на рабочых перавышае прапанову. Гэта на сустрэчы з журналістамі падкрэсліў Алег ТАКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі. Лічбы статыстыкі паказваюць, што на 1 лістапада гэтага года на аднаго беспрацоўнага па рэспубліцы прыходзіцца ў сярэднім 3 вакансіі, прычым у Мінску гэтая лічба большая ў 5 разоў.**

Як правіла, запатрабаваны рабочыя спецыяльнасці. Яны складаюць 80% ад усіх вольных працоўных месцаў у краіне (а іх у агульнарэспубліканскім банку вакансій 69 тысяч).

У сувязі тым, што рабочых рук не хапае, многія буйныя прадпрыемствы зацікаўлены ў наймане замежных грамадзян. Сёлета ў нашу краіну працаваць прыехалі каля 15 тысяч чалавек. Прычым, калі параўнаць з мінулым годам, то ў 2012-м за першае паўгоддзе ў Беларусь прыехала 5,1 тысячы рабочых, а ў 2013 за аналагічны перыяд — 10,7 тысячы. Як правіла, у нашу краіну на працу прыязджаюць грамадзяне краін СНД (пераважна Украіны), Турцыі, Кітая. Таксама сярод іх ёсць прадстаўнікі В'етнама, Бангладэш.

Такі рост выкліканы ў першую чаргу рэалізацыяй вялікай колькасці буйных інвестыцыйных праектаў. Напрыклад, кітайскія рабочыя працуюць на будаўніцтве і рэканструкцыі цеплаэлектрацэнтралі ў Пухавіцкім раёне Мінскай вобласці, гасцініцы «Пекін», адміністрацыйных будынкаў у раёне «Лебядзіны».

Другой прычынай запатрабаванасці працы мігрантаў на тэрыторыі краіны з'яўляецца выезд беларусаў на працу за мяжу. Па розных падліках, прыкладна 300 тысяч нашых суайчыннікаў зараз працуюць у іншых краінах. Прычым у Расіі, згодна з інфармацыяй айчынных кампетэнтных органаў, працуе як мінімум 100 тысяч беларусаў.

У Расійскай Федэрацыі, якая зараз знаходзіцца на другім (пасля Злучаных Штатаў) месцы ў свеце па колькасці мігрантаў, у апошняе дзесяцігоддзе ўзнікла ў сувязі з гэтым вялікая колькасць праблем: рост злачынстваў, нецярпімасць у грамадстве, перанаселенасць вялікіх гарадоў. Ці можа ўзнікнуць падобная сітуацыя ў нашай краіне? Па словах **Аляксея БЕГУНА, кіраўніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі,** такой небяспекі пакуль няма: «У Беларусі мы можам казаць пра даволі жорсткае ўпраўленне міграцыйнымі працэсамі. Як правіла, замежныя грамадзяне прыязджаюць у нашу краіну для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. Гэта так званы арганізаваны ўвоз рабочай сілы, і замежныя рабочыя працуюць у нас легальна».

У Беларусі дзейнічае Закон «Аб знешняй працоўнай міграцыі», які ўстанаўлівае асаблівасці рэгулявання працы прыезджых. У гэтым годзе супрацоўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў было выяўлена 16 тысяч выпадкаў парушэння ўстаноўленых правілаў знаходжання замежных грамадзян на тэрыторыі нашай краіны. Больш чым 1000 чалавек дэпартавалі, амаль 900 выслалі з краіны за грубае парушэнне беларускіх законаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

# БЕЗ РЫЗЫКІ ДЛЯ БІЗНЕСУ

**Ісці па шляху найменшага супраціўлення... Для паўсядзённасці такі выраз гучыць, хутчэй, як абраза, для прадпрымальніцтва — як рацыянальнае бізнес-рашэнне. З адной толькі умовай: калі яно адпавядае канцэпцыі франчайзінгу (выкарыстання кімсьці вядомага таварнага знаку на пэўных умовах).**

Скарыстацца праверанай, вядомай, эканамічна эфектыўнай сістэмай вядзення бізнесу і яго брэндам у абмен на пэўную долю даходу — менавіта на гэтым грунтуюцца ўзаемаадносіны абедзвюх кампаній. Перавагі такой мадэлі пабудовы бізнесу навідавоку. Прадпрымальнік-франчайзі амаль не рызыкуе, калі заключае дагавор з франчайзерам, бо прызнаная якасць прадукцыі, паслуг або тэхналогій, пэўная ступень вядомасці брэнду ў свеце забяспечваюць вынік (а значыць, даходнасць) адразу, без маруднага чакання, «калі ж усё пойдзе «так». Чаму ж у Беларусі малы і сярэдні бізнес пакуль рухаецца не ў бок франчайзінгу?

### ДАГАВОРЫ, ШТО ЗАПОЎНІЛІ Б «ЁМІСТАСЦЬ»

Сёння Беларусь «выпадае» з агульнасусветных тэндэнцый. Магчымасць заканадаўча замацоўваць франчайзінгавыя дагаворы з'явілася яшчэ ў 2005 годзе. З таго часу зарэгістравалі толькі 130 такіх дагавораў. Лік, відавочна, не адпавядае ёмістасці і патэнцыялу беларускага рынку.

— Мноства прадпрымальнікаў проста не маюць дастатковай інфармацыі аб тым, што такое франчайзінг, як будуюцца адносіны паміж франчайзерам і франчайзі, дзе ім шукаць адзін аднаго, — тлумачыць сітуацыю Вольга Лявонцьева, старшыня Асацыяцыі франчайзераў і франчайзі «Белфранчайзінг». — Пэўныя цяжкасці ўзнікаюць і пры ацэнцы дагавора, калі трэба грунтоўна ўзважыць, наколькі будуць парушацца ці не правы абодвух бакоў. Акрамя гэтага, беларускі бізнес пакуль не валодае дастатковай прававой культурай, што дазволіла б усвядоміць, якая інтэлектуальная ўласнасць патрапіла да яго і як яе граматна выкарыстоўваць.

### УСЕ ЧАКАЮЦЬ, КАЛІ...

Нацыянальныя франшызы прасоўваюцца на замежны рынак, на жаль, таксама неахвотна. Але не без прыемных выключэнняў. Выдатны прыклад паказваюць, напрыклад, «Белкамунмаш» і «Мілавіца». Апошняя, дарэчы, стварыла франчайзінгавую сетку з 610 аб'ектаў. Расія, Украіна, уласна Беларусь, Малдова, Казахстан, краіны Заходняй Еўропы — паўсюль можна знайсці прадукцыю гэтай кампаніі. Па словах Дзяніса Дакучыца, кіраўніка аддзела франчайзінгу СП ЗАТ «Мілавіца», дасягнуць такога выніку дазволіла граматная праца з першапачатковымі інвестыцыямі (50000 еўра плюс загрузка магазіна прадукцыяй), належнае навучанне гандлёвага персаналу і падтрымка франчайзі на ўсіх этапах развіцця яго бізнесу.

**Нямецкі бізнесмен моцна здзівіўся, што ў Беларусі так шмат патэнцыялу для рэалізацыі прадпрымальніцкай энергіі.**

Грамадскае харчаванне, гандаль, вытворчасць — вось тыя сферы, у якіх франчайзінгавыя канцэпцыі рэалізуюць сябе ў Беларусі. Большасць прадпрымальнікаў аддаюць перавагу праверанымі ідэям і тэхналогіям, і толькі некаторыя звязваюць свой бізнес з даволі рызыкоўнымі, але вельмі крэатыўнымі прапановамі. Амаль падобная сітуацыя назіраецца і ў суседняй Літве. Аднак франчайзінгавыя канцэпцыі там развіваюцца нашмат хутчэй.

— Гэтаму садзейнічаюць тры фактары: рост франчайзінгавых цэнтраў, хуткае эканамічнае развіццё пасля крызісу і выгаднае геаграфічнае становішча, — расказвае кіраўнік міжнародных праектаў па развіцці франчайзінгу ЗАТ «Advanced Advice» Вольга Міхайлоўская. — Для прасоўвання сваіх франшыз літоўцы актыўна выкарыстоўваюць рэсурсы і магчымасці сайтаў, акаўнтаў у Facebook, блогаў, семінараў, PR-мерапрыемстваў. Вядома, існуюць цяжкасці ў гэтай справе. Напрыклад, у Літве вельмі цяжка атрымаць добрае месца ў гандлёвым цэнтры, непадалёк ад прыпынкаў грамадскага транспарту. Дый не ўсе да канца разумеюць, якія перавагі франчайзінг прыносіць бізнесу. Насельніцтва Балтыйскага рэгіёна зусім не вялікае. Мяркую, што, аб'яднаўшы свае тэрытарыяльныя і дэмаграфічныя магчымасці з Беларуссю, наш рэгіён стаў бы яшчэ больш прывабным для супрацоўніцтва.

### ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЯ ЭНЕРГІЯ ШУКАЕ ВЫЙСЦЯ

А ўвогуле, як наша краіна цікавіць патэнцыяльных партнёраў? Напрыклад, Расію — стратэгічна, бо ў суседкі існуе высокі давер да якасці беларускай прадукцыі. Апошнім часам усё больш прапаноў гучыць... на нямецкай мове. Адна з іх паспяхова рэалізоўваецца ўжо сёння. Кампанія «Reisswolf Internatoinal» заключыла дагавор з беларускім прадпрымальнікам спадаром Каральковым і шукае новага партнёра для пашырэння супрацоўніцтва. Дарэчы, у пачатку года Беларусь наведваў вядомы нямецкі бізнесмен, які мае тут франчайзінгавую зацікаўленасць. Наведаўшы шматлікія гандлёвыя пляцоўкі, ён моцна здзівіўся, што ў Беларусі так шмат патэнцыялу для рэалізацыі прадпрымальніцкай энергіі. Можа, калі яна атрымае рэальнае ўвасабленне, то прадстаўніцтва міжнародных брэндаў таксама зменіць меркаванне пра стан беларускай эканомікі і нізкія спажывецкія магчымасці ў Беларусі. Беларусы выязджаюць за мяжу, і іх пакупніцкія здольнасці нашмат адрозніваюцца ад «айчынных». Магчыма, калі брэнды прыйдуць у Беларусь, яны знойдуць сабе і месца, і спажыўца?

**Любоў КАСПЯРОВІЧ.**

■ Супрацоўніцтва

# СУВЯЗІ БЕЗ ПЕРАШКОД

**Перспектывы больш цеснага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва абмеркавалі падчас сустрэчы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі Ергалі Булегенаў і губернатар Магілёўшчыны Пётр Руднік.**

Паміж рэгіёнамі абедзвюх краін ужо даўно існуюць моцныя культурныя сувязі, але шмат яшчэ можна зрабіць, каб пашырыць эканамічны складнік, адзначыў Пётр Руднік. Магілёўскім вытворцам трэба быць больш актыўнымі ў гэтым сэнсе і браць прыклад з адкрытага акцыянернага таварыства «Бабулін гладыш», якое за некалькі месяцаў паставіла ў Казахстан на паўмільёна долараў сваёй прадукцыі. Актыўны пастаўшчык сваёй прадукцыі на казахскі рынак і бабруйскае прадпрыемства «Белшына».

Ергалі Булегенаў таксама выказаў намер аб актывізацыі прамых сувязяў паміж Магілёўшчынай і казахскімі рэгіёнамі. Ён адзначыў, што трэба разгледзець усе магчымасці стварэння сумесных прадпрыемстваў і спрыяльных умоў для ўкладання інвестыцый. Разглядалася і магчымасць выбару Прыдняпроўскага краю ў якасці пляцоўкі для пасяджэння міжурадавай камісіі, у якой прымаюць удзел прадстаўнікі кіраўніцтва казахскіх рэгіёнаў.

Пётр Руднік звярнуў увагу на тое, што, улічваючы вялікую адлегласць паміж дзвюма краінамі, вельмі выгадным для перавозу грузаў можа стаць выкарыстанне Магілёўскага аэрапорта, дзе нядаўна была зроблена рэканструкцыя. Падчас сустрэчы разглядалася таксама магчымасць павелічэння ўдзелу прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці ў працы гандлёвага дома «Мінск-Астана».

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■